базу, адсутнасць кваліфікаваных кадраў, заваявалі шмат шчырых прыхільнікаў і мелі самую шырокую аўдыторыю гледачоў.

**Літаратура**

1. История белорусского кино (1924–1945 гг.). Мн., 1969. С. 19. 2. ЦПА КПБ. Ф. 4, воп. 7, с. 136, л. 256. 3. Савецкая Беларусь. 1926. 4 крас. 4. Белдзяржкіно. X год. Мн., 1934. С. 5.

**Г.А. БЫСТРОЎ, канд. пед. навук (МІК)**

## НЕКАТОРЫЯ ПРЫНЦЫПЫ ПРАФЕСІЙНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ БАЯНІСТА-КУЛЬТАСВЕТРАБОТНІКА

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падрыхтоўка баяністаў-культасветработнікаў з'яўляецца адным з важнейшых фактараў фарміравання прафесійнага ўзроўню будучых кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці. Таму патрабаванні да яе якасці павінны быць накіраваны не толькі на развіццё музычна-творчых здольнасцей, але і на ўдасканаленне спецыфічных уменняў і навыкаў, абумоўленых работай у культурна-асветных установах.

Паспяховае вырашэнне складаных шматпланавых задач, што стаяць перад будучымі прапагандыстамі музыкі, шмат у чым залежыць ад мэтанакіраванасці навучальнага рэпертуару, які адыгрывае важную ролю ў фарміраванні творчай індывідуальнасці і выканаўчага майстэрства студэнта, у яго маральна-эстэтычным выхаванні, у папулярызацыі баяна. Вядучыя педагогі і выканаўцы неаднаразова падкрэслівалі гэта, але так і не прыйшлі да адзінай пэўнай думкі. „Канцэртна-выканаўчы ўхіл", які ўкараніўся ў музычна-педагагічнай практыцы, звужвае задачы прафесійнай музычнай адукацыі.

Традыцыйныя формы і метады музычнай адукацыі, што склаліся больш як 30 гадоў назад, зараз ужо не адпавядаюць патрабаванням прафесійнай падрыхтоўкі баяніста-культасветработніка. Ліквідаваць гэты разрыў магчыма толькі на новым, якасна іншым узроўні, дасягненню якога ва ўмовах ВНУ значна перашкаджае ўстойлівасць устарэлых уяўленняў, а таксама аднабаковасць метадычнай работы і навучальнага рэпертуару. Існуючыя формы арганізацыі навучальнага працэсу на музычных аддзяленнях ВНУ, у музычных вучылішчах і вучылішчах культуры ўступаюць у супярэчнасць з сучаснымі патрэбамі грамадства ў спецыялістах, добра падрыхтаваных для масавай музычна-асветніцкай дзейнасці. Зараз навучанне ўсіх студэнтаў-баяністаў ідзе так, як быццам усе яны, без выключэння, абавязкова будуць салістамі.

Нярэдка яшчэ і ў школах, і ў ВНУ несур'ёзна ставяцца да праблемы фарміравання духоўнай культуры асобы сродкамі музыкі. На занятках,

нават пры падрыхтоўцы будучых музычных кіраўнікоў, пануе арыентацыя на засваенне гатовых ведаў, а выхаванне застаецца на ўзроўні дэкларацыі. Музыка, такім чынам, не выконвае сваёй выхаваўчай, гуманістычнай функцыі. У значнай меры гэта адбываецца з-за стаўлення да яе як да навукі, а не як да мастацка-творчага працэсу, галоўнай якасцю якога з'яўляюцца індывідуальныя адносіны да музычнага вобраза пры захаванні яго цэласнасці.

У музычнай культуры праблема фарміравання мастацкай свядомасці паўстае як адна з самых актуальных. Неабходна зрабіць асновай музычнага твора жыццё чалавека, яго духоўную, глыбінную сутнасць, без гэтага нават вялікая музыка страчвае сваё прызначэнне. Трэба памятаць аб тым, што слухач атрымае такое ідэйна-эмацыянальнае ўздзеянне ад музыкі, якое закладзе ў яе змест выканаўца. Безадказна-абыякавыя адносіны студэнта да твора, які ён выконвае ў навучальным працэсе, у далейшым адаб'юцца ў яго практычнай дзейнасці. Таму павышэнне якасці музычнай адукацыі звязваецца і з пераглядам, і з удасканаленнем навучальных планаў, форм і метадаў выкладання.

Перабудова навучальнага працэсу патрабуе, каб творчая дзейнасць студэнтаў у сценах ВНУ ператварылася ў сапраўды цікавае жыццё ў мастацтве, спрыяла росту іх прафесійнага майстэрства.

Шэраг нявырашаных пытанняў і тыповых недахопаў, якія назіраюцца ў працэсе навучання студэнтаў-баяністаў, раскрываецца ў іх навучальным рэпертуары: дыспрапорцыя ў выкананні твораў заходняй і рускай класікі, рускай народнай музыкі і музыкі другіх народаў; зніжаная цікавасць да нацыянальнай музыкі; адсутнасць мэтанакіраванага назапашвання музычна-выканаўчага матэрыялу для будучай культурна-асветнай і педагагічнай работы; захапленне адпрацоўкай тэхнічных навыкаў, „тэхналагічным" аналізам і слабае развіццё практычных канцэртмайстарскіх навыкаў.

Сучасны культасветработнік, у прыватнасці баяніст, павінен быць падрыхтаваны да ажыццяўлення на практыцы шырокага дыяпазону відаў музычнай дзейнасці. Ён павінен умець: музычна афармiць тэматычныя вечары, масавыя святы, грамадзянскія абрады, выступленне агітбрыгад, дыскатэк; цікава пабудаваць праграмы як сваіх канцэртных выступленняў, так і клубнай мастацкай самадзейнасці; выкарыстоўваць такія віды рэпертуарных распрацовак, як пералажэнне, аранжыроўка, інструментоўка, музычная рэдакцыя; кваліфікавана выконваць функцыі канцэртмайстра харавога і танцавальнага калектываў, вакальных і інструментальных груп і салістаў.

Ці атрымае студэнт-баяніст у ВНУ дастатковую для гэтага прафесійную падрыхтоўку? Шмат у чым гэта залежыць ад зместу і накіраванасці навучальнага рэпертуару.

Часта навучанне баяністаў зводзіцца толькі да сістэматычнай падрыхтоўкі канцэртных праграм. Мала ўдзяляецца ўвагі заняткам, прысвечаным развіццю іх творчага мыслення і навыкаў канцэртмайстарскага майстэр-

ства, засваенню матэрыялу для музычна-асветніцкай дзейнасці, фарміраванню самастойных поглядаў на музыку як сродак маральна-эстэтычнага выхавання.

Такая сістэма прафесійнай падрыхтоўкі баяністаў садзейнічае таму, што з'яўляюцца расчараваныя музыканты, якія не сталі салістамі, а таму вымушаны займацца педагагічнай і культурна-асветніцкай дзейнасцю, да якой у іх не сфарміраваны навыкі і ўменні.

Псіхалагічная адаптацыя да будучай прафесійнай дзейнасці адбываецца ў працэсе авалодання навучальным рэпертуарам. І калі гэты працэс ідзе паспяхова, г. зн. студэнт пераконваецца ў пастаянным росце сваёй прафесійнай падрыхтоўкі, у пашырэнні магчымасцей авалодання неабходнымі для будучай дзейнасці ўменнямі і навыкамі, тады з'яўляецца і ўпэўненасць у сваіх здольнасцях.

Якім жа павінен быць навучальны рэпертуар? Якім матэрыялам павінен авалодаць студэнт у працэсе навучання, каб адчуваць сябе поўнасцю падрыхтаваным да шырокага аспекту музычна-асветніцкай дзейнасці?

Навучальны рэпертуар можна ўмоўна падзяліць на канцэртны і прыкладны. Канцэртны рэпертуар уключае ў сябе творы, якія развучваюцца для выканання на эстрадзе, г. зн. яны выконваюцца на заліках, экзаменах, канцэртах, конкурсах, аглядах. Прыкладны рэпертуар мае ў сваёй аснове развіццё тэхнічных і прафесійных уменняў і навыкаў, неабходных для работы ў клубе. З гэтай мэтай выкарыстоўваюцца так званыя інструктыўны матэрыял (гамы, эцюды, разнастайныя практыкаванні) і канцэртмайстарская практыка (ігра на слых, чытанне нот з ліста, транспанаванне, імправізацыя і акампанементы да вакальных і інструментальных твораў, музычнае суправаджэнне ў харэаграфіі).

Канцэртны рэпертуар у сваю чаргу падзяляецца на арыгінальны, апрацоўкі народных песень і танцаў і класічны. Значную частку рэпертуару баяністаў займаюць пералажэнні, пры адборы твораў для якіх у першую чаргу неабходна ўлічваць эмацыянальна-мастацкую вобразнасць, значнасць эстэтычнага зместу твора для прафесійнага развіцця выканаўцы. Трэба ўхваляць і ўсяляк актывізаваць самастойную работу студэнтаў па пералажэнні твораў, напісаных для іншых інструментаў, уключаць іх у праграмы.

Часта можна пачуць пярэчанні супраць выканання баяністамі твораў, напісаных для іншых інструментаў. Прычына гэтага – існуючая думка, што любое пералажэнне з'яўляецца скажэннем арыгінала, і непазбежныя пры гэтым дынамічныя, тэмбравыя і фактурныя змяненні не спрыяюць правільнаму ўспрыманню мастацкага вобраза. Музычна-выяўленчыя магчымасці баяна досыць вялікія для выканання самых разнастайных твораў. Маючы ярка выяўленую нацыянальную індывідуальнасць, якая ўмяшчае ў сябе разнастайную гарманічную фактуру, з вялікім рэгістравым і дынамічным дыяпазонам, здольны спяваць, імітуючы чалавечы голас і іншыя інструменты, баян можа ўзнаўляць музыку розных стыляў і эпох.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Правамернасць пераладжэнняў пацвярджае сабой увесь ход гістарычнага развіцця сусветнага музычнага мастацтва. Кампазітары не толькі рабілі пераладжэнні з мэтай пашырэння рэпертуару для таго ці іншага інструмента, а перш за ўсё, адчуваючы ў творы скрытыя рэзервы, значна ўзбагачалі і дапаўнялі мастацкі вобраз новымі фарбамі, тэмбрамі і фактурай. Пераладжэнні з'яўляюцца глыбока творчым працэсам, і змяненні пры ім непазбежныя. Сярод пераладжэнняў для баяна першае месца належыць творам для аргана і фартэпіяна – інструментаў са шматвяковай гісторыяй. Аднак трэба ўлічваць і тое, што, нягледзячы на вялікія магчымасці сучаснага баяна, далёка не ўсе творы могуць гучаць на ім. Таму да выбару п'ес, прызначаных для пераладжэння, трэба падыходзіць асцярожна, дакладна выяўляючы аўтарскую задуму.

Для таго каб стаць сапраўдным музыкантам, неабходна глыбокае вывучэнне ўсіх жанраў і стыляў розных эпох. Класічная спадчына павінна займаць дастойнае месца ў практыцы баяністаў. Некалі баян служыў для велізарнай масы аматараў прапагандыстам шэдэўраў класікі, і ў гэтым праяўлялася яго вялікае грамадскае значэнне. Зараз ён пачаў страчваць былыя пазіцыі. У рэпертуары канцэртуючых баяністаў-лаўрэатаў усё радзей гучаць творы рускіх класікаў. Мала іх і ў навучальным рэпертуары студэнтаў. Тое ж можна сказаць і аб творах заходніх класікаў (Ф. Ліста, Ф. Шуберта, Р. Шумана, Ф. Шапена, Э. Грыга, Ж. Бізэ, Р. Вагнера, Д. Расіні і інш.). Настаў момант масавага пераўзбраення баяністаў, г. зн. набыцця імі якасцей, неабходных кожнаму музыканту-прафесіяналу: глыбокага ведання асноў музычнай творчасці розных кампазітараў, шырокага кругагляду, віртуознай тэхнікі, вобразнасці мыслення, інтэлекту. Набыццё іх шмат у чым залежыць ад навучальнага рэпертуару, і тут зноў становіцца відавочнай неабходнасць класічнай разнастайнасці.

Толькі пры выкананні высокамастацкай музыкі як выканаўца, так і слухач могуць адчуць радасць дачынення да прыгожага. На жаль, пераладжэнне класічных твораў для баяна носіць стыхійны характар і далёка не ўсе з іх зроблены на высокім прафесійным узроўні.

Значнае месца ў навучальным рэпертуары займае поліфанічная музыка. Яе роля ў развіцці музычнага слыху, памяці, мыслення, тэхнічнага майстэрства неацэнная. Поліфанія І.-С. Баха, даведзеная да дасканаласці, з'яўляецца сапраўднай школай для любога музыканта.

Усе элементы бахаўскага пісьма (характарыстыка тэмы і проціскладанняў, меладычная выразнасць кожнага голасу і інш.) патрабуюць ад навучэнца ўважлівага аналізу, дакладнасці гукаатрымання, валодання рознымі відамі туш. Уменнем надаць розную афарбоўку кожнаму голасу, развіццю ліній, у якіх не супадаюць свае кульмінацыі і спады, асэнсаваць запытальна-адказныя суадносіны тэмы і „спадарожніка", рытмічныя і артыкуляцыйныя кантрасты тэмы і проціскладання большасць студэнтаў-баяністаў валодае недастаткова.

Пэўныя цяжкасці ў баяністаў паўстаюць і пры выкананні санат венскіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

класікаў. Трэба памятаць, што ў аснове санат Ф.-І. Гайдна і Л. ван Бетховена ляжыць прынцып сімфанічнага мыслення іх аўтараў. Фартэпіянныя ж санаты В.-А. Моцарта – свайго роду маленькія оперныя уверцюры. Але, на жаль, гэтыя глыбока індывідуальныя рысы кампазітараў, а таксама агульныя моманты, характэрныя для выканання санатнага алегра венскіх класікаў, не знаходзяць пераканаўчага ўвасаблення ў выкананні некаторых баяністаў.

За апошнія дзесяцігоддзі асабліва ўзбагацілася, стала больш яркай інтанацыйна-вобразная палітра арыгінальнай баяннай літаратуры, значна пашырыліся формы яе бытавання. Яркімі каларытнымі фарбамі вылучаюцца творы для баяна М. Чайкіна, К. Мяскова, І. Яшкевіча, У. Залатарова, В. Сямёнава, В. Грыдзіна, У. Зубіцкага, А. Цімашэнкі, В. Іванова, Я. Дзярбенкі і шэрага іншых кампазітараў. Яны заслужана карыстаюцца вялікай папулярнасцю і займаюць асобнае месца ў навучальным рэпертуары. У цяперашні час, калі створана і ствараецца шмат твораў спецыяльна для баяна, з'явіліся праблемы, звязаныя з пашырэннем арыгінальнага рэпертуару і далейшым выкарыстаннем класікі. Напрыклад, многія баяністы захапляюцца толькі арыгінальнымі творамі і забываюць аб сваёй агульнай музычнай адукацыі. Такі аднабокі падыход наўрад ці можа спрыяць росту іх прафесіянальнага майстэрства. У сучаснай музыцы побач са значнымі творамі сустракаюцца слабыя і спрэчныя. Нярэдка ў іх пераважае захапленне канструктывізмам, а пошукі арыгінальнасці і новых кампазітарскіх прыёмаў часта адводзяць аўтараў ад вырашэння мастацкіх задач. Многія арыгінальныя творы далёка не адпавядаюць патрабаванням, якія сёння прад'яўляюцца да выканаўчага мастацтва.

Баяніст не зможа дасягнуць вяршынь майстэрства, калі будзе іграць толькі арыгінальны рэпертуар. Праграма павінна папаўняцца за кошт вядомых сучасных твораў айчынных і замежных кампазітараў. Новыя інтанацыі, рытмы, гармоніі, лады выклікаюць цікавасць у студэнтаў, пашыраюць іх музычны кругагляд, павышаюць актыўнасць засваення рэпертуару і эфектыўнасць яго выканаўчага праяўлення.

Аднак уключэнне ў навучальны рэпертуар новай музыкі, музыкі „авангарда" яшчэ не вырашае самой праблемы яе вывучэння. Модныя ўплывы нярэдка падрываюць асновы традыцыйнай падрыхтоўкі выканаўцы. Калі ў працэсе навучання адбываецца крэн у бок найноўшых накірункаў музыкі, гэта ў сваю чаргу адмоўна адбіваецца на ўзроўні інтэрпрэтацыі іншых эпох і стыляў. Развіццё музычнага мастацтва павінна адчувацца студэнтамі як цэласны працэс, а сама новая музыка – як вынік таго развіцця, тым больш, што яна мае выдатныя ўзоры ў творчасці А. Пракоф'ева, Дз. Шастаковіча, А. Хачатурана, Б. Бартака, П. Хіндэміта.

Дзякуючы свайму эмацыянальнаму ўздзеянню музыка садзейнічае збліжэнню народаў, таму што па-сапраўднаму любіць і разумець незнаёмы нам народ, як адзначаў С. Маршак, мы пачынаем толькі пасля таго, як нас паланіць і кране яго мастацтва. У гэтым – важнасць вывучэння музыч-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нага мастацтва розных народаў і краін для інтэрнацыянальнага выхавання студэнтаў.

Кожны баяніст павінен лічыць сваім абавязкам прапаганду лепшых узораў народнай музыкі, як беларускай, так і іншых народаў свету. У ёй адлюстроўваюцца самабытнасць і непаўторнасць характэрных рыс і асаблівасцей кожнага народа, значнасць яго духоўнага жыцця, яго гісторыя, культура, побыт. Усё гэта надае ёй ідэйную глыбіню і важкасць светаадчування, светапоглядную накіраванасць. Музыка народаў не толькі нашай краіны, але і многіх краін свету вельмі шырока адлюстравана ў серыі зборнікаў для баяна і акардэона „Народная музыка".

Аднак, на вялікі жаль, гэтыя апрацоўкі не знаходзяць свайго ўвасаблення ў выканаўчай творчасці баяністаў. Не ўлічана іх практычная і педагагічная каштоўнасць у навучальным рэпертуары студэнтаў-баяністаў, што з'яўляецца значным недахопам у іх прафесійнай падрыхтоўцы. Слабеючыя пазіцыі баяна ў зносінах з народам неабходна ўмацоўваць і шляхам актыўнага ўключэння ў рэпертуар студэнтаў папулярнай бытавой музыкі. Далёка не кожны баяніст можа выканаць у характары, з вялікім густам і майстэрствам польку, старадаўні рускі вальс, які-небудзь іншы папулярны танец ці песню. Чамусьці лічыцца непрэстыжным уключаць іх у праграмы кантрольных праслухоўванняў, залікаў, экзаменаў. У рабоце ж над такімі творамі можна ставіць самыя разнастайныя творчыя задачы: удасканаленне выканаўчага майстэрства; набыццё вопыту для пэўнай практычнай работы; фарміраванне навыкаў культурна-асветніцкай дзейнасці. Нярэдка ж яшчэ сустракаюцца такія факты, калі баяністы, скончыўшы ВНУ, акрамя двух-трох складаных твораў нічога не могуць сыграць: на слых іграць яны не навучыліся, таму што гэтаму ў працэсе навучання не надавалася ўвагі, а захаваць у памяці тыя складаныя творы, якія падрыхтоўваліся да залікаў і экзаменаў, аказалася не па сілах.

Уключэнне ў навучальны рэпертуар твораў з бытавой музыкі дазваляе студэнту самастойна і сістэматычна пашыраць свае вобразна-эмацыянальныя ўяўленні, а не замыкацца ў цесным коле запланаванага рэпертуару. У выніку раскрываюцца магчымасці самастойнага ўвасаблення ўжо вядомых элементаў мастацкага мыслення.

Пашырэнне прафесійнай падрыхтоўкі баяніста непасрэдна звязана і з паступовым вывучэннем школьнага рэпертуару, што ў музычным і выканаўчым развіцці будучага музыканта-асветніка вельмі істотна. Нягледзячы на тое што частку гэтага рэпертуару студэнты ўжо вывучалі раней, прачытанне яго на дадзеным этапе будзе іншым: па-першае, яно стане больш асэнсаваным, бо змяніўся інтэлектуальны і музычны ўзровень развіцця навучэнцаў, ускладніліся задачы, пастаўленыя інстытуцкім працэсам навучання, узраслі патрабаванні да выканання; па-другое, спалучэнне п'ес школьнага рэпертуару з больш складанымі па мове і сродках выразнасці творамі дазволіць выявіць пераемнасць сувязей у творах аднаго і таго ж або розных аўтараў. Шмат у чым супадаюць і выканаўчыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

задачы (работа над гукам, інтанацыяй, фразіроўкай), а ўзровень выканання асноўнай часткі развучваемых твораў менш складаны. У гэтых умовах студэнта не гняце цяжкасць матэрыялу, і асноўную ўвагу можна засяродзіць на аналізе сцэнічнага самаадчування. Паступовы перанос гэтага вопыту ў выкананне складаных праграм станоўча адаб'ецца на выніках эстраднага выступлення.

Творы бытавой музыкі і школьнага рэпертуару трэба ўключаць у індывідуальны план студэнта разам з асноўным навучальным рэпертуарам на працягу ўсяго перыяду навучання баяніста, а таксама выносіць часткова на кантрольныя праслухоўванні, залікі і экзамены. Паступова з гэтага агульнага фарміруецца пастаянны канцэртны рэпертуар студэнта, з якім ён выступае на шэфскіх канцэртах. Такая выканаўчая практыка адыгрывае асабліва важную ролю ў прафарыентацыйнай рабоце са студэнтамі завочнага аддзялення аркестравай спецыялізацыі. Большасць з іх працуе ў музычных школах, і асноўным месцам іх музычна-асветніцкай дзейнасці з'яўляецца агульнаадукацыйная школа, дзе яны, апрача выканання твораў, могуць вобразна і лаканічна, у даступнай для школьнікаў форме раскрыць і змест музыкі, якую выконваюць.

Планамернае стварэнне і пашырэнне з году ў год цікавага, разнастайнага і высокамастацкага канцэртнага рэпертуару павінна насіць практычную накіраванасць для далейшай прафесійнай дзейнасці будучых культасветработнікаў.

У навучальным рэпертуары недастаткова пакуль што адлюстравана канцэртмайстарская падрыхтоўка. Трэба распрацаваць педагагічныя і праграмныя патрабаванні да ўзроўню падрыхтоўкі студэнтаў у залежнасці ад тэрмінаў навучання. Неабходны і канкрэтны праграмны пералік розных накірункаў канцэртмайстарскай падрыхтоўкі ў навучальным плане. Канцэртмайстарская практыка, якая мае важнае значэнне ў падрыхтоўцы баяністаў-культасветработнікаў, пакуль што застаецца нерэалізаванай задачай.

Разнастайная жанравая і тэматычная накіраванасць навучальнага рэпертуару змяшчае ў сабе вялікія магчымасці не толькі прафесійнага ўдасканалення баяніста-культасветработніка, але і невычэрпныя рэсурсы маральна-эстэтычнага ўздзеяння на слухачоў.

М.Л. КУЗЬМІНІЧ, канд. пед. навук (МІК)

## ПРАБЛЕМА ДЫФЕРЭНЦЫЯЦЫІ Ў ПАДРЫХТОЎЦЫ МУЗЫКАНТАЎ

Адметнай рысай перабудовы вучэбна-выхаваўчага працэсу ў ВНУ становіцца наданне яму ўсё большай самастойнасці ў вырашэнні пытанняў падрыхтоўкі спецыялістаў, прывядзенне сістэмы адукацыі ў адпаведнасць з нацыянальнымі асаблівасцямі, разняволенне працы выкладчыка